View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

**А.С.Васілеўская** (Рэспубліка Беларусь, Мінск, БДПУ)

# ФУНКЦЫЯНАВАННЕ ДЗЕЯСЛОЎНЫХ МЕТАФАР У МАСТАЦКІМ ТЭКСЦЕ (НА МАТЭРЫЯЛЕ ТВОРАЎ В.АДАМЧЫКА)

Адной з галоўных ідэй сучаснай лінгвістыкі з'яўляецца палажэнне аб цэнтральнай ролі дзеяслова ў сістэме мовы [1, 103]. Гэта не выпадкова: адлюстраванне падзей і з'яў рэчаіснасці адбываецца не ў слове, а ў сказе, у якім дзеяслоў займае галоўную пазіцыю. Даследчыкі адзначаюць ёмістую семантычную структуру, канструктыўную сілу дзеяслова, яго дынамічнасць, выразнасць [2]. Аднак, на жаль, лінгвісты не часта звяртаюцца да аналізу ўжывання дзеяслова з пераносным значэннем, аддаючы перавагу іменным метафарам. Звязана гэта, на нашу думку, з тым, што мінімальным кантэкстам для разумення значэння дзеяслоўнай метафары з'яўляецца прэдыкатыўнае спалучэнне, якое складае аснову сказа. Існуюць пэўныя цяжкасці і ў раскрыцці тонкіх нюансаў значэння, якое набывае дзеяслоў у кантэксце.

Сістэмнасць пераносных значэнняў дзеяслова можа быць выяўлена з улікам прыналежнасці іх да больш строга арганізаванай часткі лексічнай сістэмы – лексіка-семантычных груп. Таму мы вылучаем метафарычныя дзеясловы, якія характарызуюць канкрэтныя і абстрактна-псіхалагічныя паняцці.

Дзеясловы першай групы валодаюць вялікай экспрэсіўнай сілай, што дае магчымасць выкарыстоўваць іх для характарыстыкі герояў, стварэння пейзажаў, лірычных адступленняў. Пераносна-вобразнае значэнне слова, цесна звязанае з кантэкстам, заўсёды падпарадкоўваецца агульнай ідэі твора, стварае асаблівую танальнасць у творы.

У поўным трагізму і болю апавяданні В.Адамчыка «Сонечны зайчык» захад сонца перадае перыфраза ***неба аблівалася крывёю***: *Яна пабегла на гэты піск аж у другі канец вёскі, туды, дзе з-за нечае страхі выкочваўся вялікі чырвоны месяц.* ***Неба на ўсходзе аблівалася крывёю*** (Сонечны зайчык, 206) [3]. У апавяданнях «Хата» і «Ліповы цвет» пейзаж выклікае адчуванне роднасці, крэўнасці, далучанасці да роднай зямлі, што дасягаецца метафарычным выкарыстаннем дзеясловаў ***купацца*** і ***нанізвацца***: *Глыбока ў хмарах* ***купаўся*** *круглы* ***месяц*** (Ліповы цвет, 132). *На вострую маладую траву* ***нанізвалася раса*** (Хата, 158).

Аказіянальнае значэнне набывае ў рамане «Год нулявы» дзеяслоў ***утрамбавацца,*** які стварае ў кантэксце партрэт мажнай жанчыны, абвешанай пакункамі і сумкамі, і набывае выразную іранічную афарбоўку: *[Мужчына] схапіў цяжкі саквояж і... чакаў, покуль у аўтобус не* ***ўтрамбуецца жонка*** (Год нулявы, 133).

У творах В.Адамчыка самую вялікую групу складаюць спалучэнні дзеясловаў, якія характарызуюць абстрактна-псіхалагічныя паняцці (60%).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

З іх дапамогай перадаецца філасофска-абагульнены погляд на жыццё, выказваюцца адносіны да гістарычных падзей.

Пры апісанні пачуццяў аўтар метафарызуе дзеясловы, суадносныя са з'явамі прыроды або прадметамі побыту, што надае тэксту нагляднасць, асацыятыўнасць, вобразнасць. Традыцыйным для пісьменніка з'яўляецца супастаўленне пачуццяў з патокам вады. Метафары, у якіх рэалізуецца такое супастаўленне могуць перадаць і ледзь прыкметнае з'яўленне пачуцця (***высачыцца***, ***разлівацца***) і моцнае, бурнае яго праяўленне (***бушаваць, кіпець***): *— Прыходзь, Аляксандрачка, — як мог ласкава папрасіў Міця і ўчуў, як у самога* ***высачылася*** *на сподзе душы даўняя* ***дабрата*** *да сястры* (І скажа той, хто народзіцца, 21).

Нярэдка пісьменнік актуалізуе пераносна-вобразнае ўжыванне дзеясловаў параўнаннямі ***як бурная паводка, як цяжкая вада***: *Як з заставак цяжкая вада*, ***падала, круцілася і бушавала*** *ў грудзях Літавара* ***злосць****, што за Хрысцю ён ніколі не даруе* (Год нулявы, 247). Азначэнне ***цяжкі*** ўзмацняе экспрэсіўнасць метафарычных дзеясловаў, перадае той цяжар, які прыгнятае чалавека, апанаванага злосцю.

Нярэдка В.Адамчык супастаўляе пачуцці і агонь: *У Міцевай душы, заняўшыся вялікім пякельным агнём,* ***гарэла злосць*** *і* ***крыўда*** *на сябе, на Чэсю…* (І скажа той, хто народзіцца, 239). *І гэтае* ***спадзяванне****, як абсыпаны сівым калматым попелам ачахлы жар, раптам* ***пачынала мігцець і дыхаць агнём*** (Тамсама, 31).

Метафарызацыя дзеяслова можа выклікаць у кантэксце цэлы комплекс асацыяцый: слова ***дрыжаць*** 'мігацець, трапятаць' (пра агонь, святло) паказвае з'яўленне пачуцця. Асацыятыўная сувязь метафары з назоўнікам ***агонь*** падтрымліваецца азначэннямі ***светлы***, ***трапятлівы***, ствараючы малюнак светлага, нясмелага першага кахання: *Міця… падаўся да стала: у сэрцы* ***задрыжала*** *нечаканае* ***спадзяванне…*** (Чужая бацькаўшчына, 234). *Нешта* ***светлае, трапятлівае*** *заварушылася ў душы…* (Тамсама, 235).

З індывідуальна-аўтарскім значэннем 'азвацца, напомніць, заявіць пра сябе' ўжываецца ў творах В.Адамчыка дзеяслоў ***перавярнуцца***: *У Хрысці гарачынёю* ***перавярнулася*** *страшная* ***падазронасць*** (І скажа той, хто народзіцца, 138). *…у Алесінай душы вялікім задушлівым клубком* ***пераварочваўся*** *развярэджаны даўні* ***боль*** (Год нулявы, 189). У метафары адлюстраваліся і працэс з'яўлення пачуцця, яго развіццё, і ўздзеянне на чалавека. У творах пісьменніка такая амбівалентнасць унутранага стану дасягаецца і праз метафарызацыю дзеяслова ***мяшацца***: *…тады* ***пакута і радасць змяшаліся*** *ў адно, і я быў як хворы* (Калі ападае лісце, 113). *Мішку было брыдка,* ***сарамяжлівасць мяшалася з радасцю*** (Хата, 155).

У дзеяслоўных метафарах, што характарызуюць пачуцці, выражаюцца эмоцыі пераважна з негатыўным адценнем – 31%, станоўчыя складаюць толькі 11%. Дзеясловы найчасцей метафарызуюцца ў

спалучэнні з назоўнікамі ***боль, смутак, панурасць, крыўда*** і інш. Большасць такіх метафар – агульнамоўныя (індывідуальна-аўтарскія складаюць 41% сярод дзеяслоўных метафар): ***ачарсцвець душою, рэвізор кіпіць, злосць варушыцца*** і інш. Аднак пісьменнік узнаўляе вобразную двухпланавасць метафары праз узаемадзеянне з параўнаннем.

Дзеяслоў ***ачахнуць*** і ***выветрыцца*** ўжываюцца ў беларускай мове для характарыстыкі псіхічных працэсаў, у кантэксце іх вобразнасць ажыўляецца параўнаннем ***як попел***, якое актуалізуе прамое значэнне дзеясловаў: *З часам* ***страх ачах і выветрыўся***, <u>як попел</u> (Кароль Нябожа, 476).

Параўнанне ***як чорны і глыбокі вір*** узнаўляе вобразную двухпланавасць метафарычнага спалучэння ***забушавала рэўнасць***: *І дзікая страшная* ***рэўнасць***, <u>*як чорны і глыбокі вір*</u>, *раптам* ***забушавала*** *ў ім,* ***падняла*** *Міцю з рыпучага крэсла і* ***вынесла*** *да зачыненых на цяжкі крук дзвярэй* (І скажа той, хто народзіцца, 189). Параўнанне ў кантэксце не проста ажыўляе вобразнасць метафары, на яго аснове адбываецца метафарычнае разгортванне: з пераносным значэннем ужываюцца дзеясловы ***падняць*** і ***вынесці***, якія паказваюць, як моцна валодае чалавекам рэўнасць, як яна пачынае панаваць над ім.

Нярэдка ў мікракантэксце параўнанне тлумачыць і раскрывае змест індывідуальна-аўтарскай метафары. У спалучэнні ***душа акрапілася палёгкаю і ратункам*** параўнанне ***як вільготным дажджом*** раскрывае аказіянальнае значэнне дзеяслова ***акрапіцца*** ‘стаць свежым, ажывіцца’: — *Куды ты пойдзеш? – ён [Міця] учуў, як у яго* ***палёгкаю*** *ўжо* ***і ратункам***, <u>*як вільготным дажджом*</u>, ***акрапілася душа*** (І скажа той, хто народзіцца, 61).

Паступовую страту добрых адносін у сям’і В.Адамчык перадаў метафарай ***прыязь раз’язджаецца***, дзе дзеяслоў набывае значэнне ‘паступова слабець, знікаць’. Вобразнасць метафары падтрымліваецца параўнальным сказам ***як раз’язджаецца слабкі вузел***: *…яна ціха і незаўважна, гэтая* ***прыязь, раз’язджалася***, <u>*як раз’язджаецца слабкі вузел*</u> (Калі ападае лісце, 126).

Часта для актуалізацыі метафарычнага сэнсу дзеяслова выкарыстоўваецца творны параўнання. Так, супастаўленне радасці і птушкі ўзмацняе сэнсавую двухпланавасць метафар ***праклюнуцца*** і ***грэцца*** і сведчыць пра няпэўнасць, слабасць гэтага пачуцця: *У душы кволым* <u>*нядужым пташаняткам*</u> ***праклюнулася*** *ўчарашняя* ***радасць*** (І скажа той, хто народзіцца, 238-239). <u>*Нядужай пташачкай*</u> *у Міцевай душы* ***грэлася першая радасць*** (Год нулявы, 147).

Дзеясловы ***ўпіцца*** і ***жыгнуць*** ‘узнікнуць, прычыніўшы боль’ падтрымліваюцца назоўнікам ***джала***, ужытым у творным склоне: *І* <u>*балючым джалам*</u> ***у сэрца ўпіўся дакор***, *чаму не паехаў з дваццаць сёмым палком уланаў туды, на фронт…* (Год нулявы, 328).

Узбагачэнне агульнамоўных дзеяслоўных метафар адбываецца і шляхам падбору сінонімаў: побач могуць ужывацца дзеясловы з прамым і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пераносным значэннем — ***павесялець*** ‘стаць, зрабіцца вясёлым, весялейшым’ і ***адпусціцца*** перан. ‘палагаднець, змякчыцца’: *Алеся нават, здаецца,* ***павесялела, адпусцілася*** *ад свае панурасці* (Год нулявы, 131).

Найбольш часта поруч ужываюцца метафарычныя дзеясловы: *І сэрца працяла неадчэпная крыўда ці то віна, што ён [Літавар] уцёк адтуль, астаўся жывы і ідзе дадому, а там людзей* ***грызе і заядае смутак*** *па жонцы, родным полі, дзяўчыне, да якое, можа, адзін бог ведае, калі ты вернешся...* (І скажа той, хто народзіцца, 122). Парнае выкарыстанне метафарычных дзеясловаў ***грызці*** і ***заядаць,*** асацыятыўна звязаных паміж сабой, актуалізуе вобразную двухпланавасць слоў, стварае экспрэсіўную, эмацыянальную карціну смутку людзей, якія знаходзяцца ў палоне.

Узмацняецца экспрэсіўнасць выкладу і ва ўжыванні метафарычных дзеясловаў ***бушаваць*** перан. ‘выяўляцца, развівацца з незвычайнай сілай’ і ***віраваць*** перан.’бурліць, кіпець’: *І помслівая* ***злосць забушавала, завірыла*** *ў Корсакавай душы да Імполя…* (І скажа той, хто народзіцца, 160).

Нярэдка ў кантэксце агульнамоўную метафару падтрымлівае індывідуальна-аўтарская, дзе метафарызуецца дзеяслоў таго ж семантычнага комплексу: словы ***свяціцца*** і ***ззяць*** у беларускай мове ўжываюцца як сінанімічныя. Дзеяслоў ***ззяць*** у спалучэнні з назоўнікам ***радасць*** абазначае ‘ярка праяўляцца ў чым-н.’, а слова ***свяціцца*** пад уплывам кантэксту набывае пераноснае значэнне ‘ярка праяўляцца’: *Яна [Хрысця] заківала галавою, нічога не гаворачы, і ў мокрых вачах яе* ***свяцілася і ззяла*** *патайная глыбокая* ***радасць*** (І скажа той, хто народзіцца, 207).

Асацыятыўна зблізкаюцца паміж сабой дзеясловы ***запячы*** і ***загарэцца***: *Але пад сэрцам у Міці* ***запякло, загарэлася шкадаванне****, што бачыць яе [школу] мо астатні раз…* (Голас крыві брата твайго, 244). Дзеяслоў ***загарэцца*** ў спалучэнні з назоўнікамі – назвамі пачуццяў набывае значэнне ‘ўзнікнуць, пачацца з вялікай сілай; узгарэцца’. Дзеяслоў ***запячы*** метафарызуецца ў кантэксце – ‘з’явіцца, узнікнуць’ і ўплывае на сэнсавае пашырэнне слова ***загарэцца. Запячы*** абазначае самы пачатак дзеяння, ***загарэцца*** – яго пачатак і працяг.

Абнаўленне агульнамоўнай метафары адбываецца шляхам разгортвання на яе аснове цэлага метафарычнага кантэксту. Словазлучэнне ***перагарэла каханне***, дзе дзеяслоў ***перагарэць*** абазначае ‘знікнуць, прайсці, прытупіцца’, атрымлівае працяг у метафарычным ужыванні назоўніка ***попел*** ‘цяжкі, непрыемны ўспамін’: *Мінулася і прапала маладосць,* ***перагарэла каханне, астаўся*** *на душы толькі халодны, астылы* ***попел*** (Голас крыві брата твайго, 272).

Разгорнуты малюнак стварае аўтар пры апісанні перажыванняў Алесі, адштурхоўваючыся ад пераноснага значэння дзеяслова ***перакіпець*** ‘перастаць бурна праяўляцца; супакоіцца, заціхнуць’: ***Перакіпела, перасохла душа, зарасла і закідалася,*** <u>*як стары калодзезь*</u>, ***брудам***

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***абгавораў, няверы, помсты** і вялікага неадкупнага **граху** перад залувіцаю і свекрывёю, што мардаваў і пакутаю мучыў яе [Алесю]* (Год нулявы, 155). У спалучэнні з метафарычным дзеясловам ***перасохнуць*** дзеяслоў ***перакіпець*** набывае значэнне 'страціць адчувальнасць, ачарсцвець'. Дзеясловы ***зарасці*** і ***закідацца***, вобразная двухпланавасць якіх актуалізуецца параўнаннем ***як стары калодзезь*** і назоўнікам ***бруд*** перан. 'напластаванне адмоўных якасцей', абазначаюць 'напоўніцца, авалодаць кім-н.'.

Такім чынам, у прозе В.Адамчыка пераважаюць метафары, якія характарызуюць абстрактна-псіхалагічныя паняцці. Праз метафарычнае выкарыстанне дзеяслова аўтар імкнецца паказаць складанасць, супярэчлівасць, неадназначнасць чалавечага «я». Метафары ўзаемадзейнічаюць з параўнаннямі, якія выконваюць у кантэксце двайную функцыю: актуалізуюць вобразную двухпланавасць агульнамоўных дзеяслоўных метафар і раскрываюць змест індывідуальна-аўтарскіх. Характэрнай асаблівасцю індывідуальнага стылю пісьменніка з'яўляецца выкарыстанне метафар-дзеясловаў у якасці кантэкстуальных сінонімаў.

## Спіс літаратуры


1. Кубрякова, Е.С. Части речи в ономасиологическом освещении / Е.С.Кубрякова. – М.: Наука, 1978. – 115 с.

2. Ваулина, Е.Ю. Глагольная метафора в современном русском языке (материалы для спецкурсов по лексикологии) / Е.Ю.Ваулина. – СПб: Ин-т лингвист. исследований, 1993. – 33 с.; Тропина, М. Глагол как средство речевого воздействия (в публицистике на международные темы) / М.Тропина. – М.: Изд-во МГУ, 1989. – 95 с.

3. Цытаты падаюцца па выданнях: Год нулявы: Раман. – Мінск: Маст. літ., 1983. – 396 с.; Голас крыві брата твайго: Раман, апавяданне. – Мінск: Маст. літ., 1991. – С. 3-277; I скажа той, хто народзіцца: Раман. – Мінск: Маст. літ., 1987. – 319 с.; Калі ападае лісце // Дзікі голуб: Апавяданні. – Мінск: Маст. літ., 1972. – С. 111-141; Кароль Нябожа // Выбраныя творы: У 3 т. – Мінск: Маст. літ., 1995. – Т. 1. – С. 463-478; Ліповы цвет // Млечны Шлях: Апавяданні. – Мінск: Дзяржвыд. БССР, 1960. – С. 127-144; Сонечны зайчык // Раяль з адламаным вечкам: Апавяданні. – Мінск: Юнацтва, 1990. – С. 202-207; Хата // Раяль з адламаным вечкам: Апавяданні. – Мінск: Юнацтва, 1990. – С. 151-163; Чужая бацькаўшчына // Выбраныя творы: У 3 т. – Мінск: Маст. літ., 1995. – Т. 1. – С. 13-334.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ